**Марыя Бень**

## Адна памылка

“Я рэдка ўспамінаў пра маці. І нават калі ўспамінаў, не меў магчымасці і жадання прыехаць. Я не мог патраціць нават адзін дзень, каб проста наведаць яе і спытаць, як яна сябе адчувае. Тых некалькіх слоў, што пан Шчубальскі пісаў пра яе, было вельмі мала, але яны супакойвалі мяне: «… а маці твая жывая, не хвалюйся».

Я жахнуўся, калі ў старой, бедна апранутай жанчыне пазнаў маці, якая калісьці мяне нарадзіла, гадавала, а потым згадзілася аддаць пану Шчубальскаму, тым самым рэзка змяніўшы мой лёс. Проста выгнаць яе з дому, кінуўшы пад ногі пару купюр, было неверагодна цяжка, але гэта было адзінае правільнае выйсце. Так я тады думаў…

Пасля таго, як я расказаў жонцы ўсю праўду, яна перастала са мной размаўляць. Ліза не разумела, як я мог так абысціся са сваёй мамай, бо яе бацькі да нас рэгулярна прыязджалі і жонка іх вельмі любіла. Загаварыла яна са мной толькі праз тры тыдні, калі прыйшоў штомесячны ліст ад пана. У гэтым плане ён быў вельмі пунктуальны. Раз у месяц прысылаў ліст, у якім было пяць радкоў – ні больш, ні менш. І пяты прысвячаўся маёй маці. Але на гэты раз іх было больш, а некалі акуратны почырк скакаў па радках.

Звычайна жонка сама чытала ліст і коратка пераказвала мне змест. Але ў той вечар яна перадала мне злёгку пакамячаны лісток, рукі яе дрыжалі. «Маці твая памерла тры тыдні таму. Прыедзь на магілу», значылася ў лісце… Я, у адрозненне ад Лізы, успрыняў гэту навіну з напускным спакоем. Мая жонка, прыйшоўшы ў сябе, тут жа загадала падаць коней і паставіла мяне перад фактам: «Мы едзем на магілу зараз! Гэта не абмяркоўваецца!» Я вельмі кахаў яе, але ў той момант мяне перапаўняла нянавісць. Я не хацеў вяртацца ў тое месца, з якога заўсёды так жадаў з’ехаць…

Я ішоў садзіцца ў сані, як ідуць на эшафот. Я памятаю, як міма мяне прабег рыжы кот… Памятаю, як скрыпеў снег пад маімі нагамі… Памятаю, як ад марозу калола рукі… Памятаю, здаецца, кожную дробязь, звязаную з гэтым момантам. Было такое адчуванне, быццам ён працягваўся вечнасць. Аднак вось я ўжо сяджу ў санях і еду ў родную вёску. Было вельмі холадна. Мая жонка мацней закуталася ў сваю шубу, але ўсё роўна яна дрыжала. Яе рукі былі схаваны ў муфтачку, якую я ёй некалі прывёз з-за мяжы. Здаецца, яна цуралася мяне. Сумны пейзаж за акном не мяняўся на працягу ўсяго шляху. Голыя лясы змяняліся заснежанымі палямі і рэдкімі вёсачкамі. Я нервова пастукваў нагой аб нагу. «Прыехалі, пан», – сказаў мне фурман, спыняючы коней.

Ужо пачало цямнець, і жонка баялася, што мы не зможам знайсці магілу. Наконт  могілак мы не памыліліся. У гэтай маленькай вёсцы яны былі адны. Мы ішлі да трухлявай брамкі супраць ветру. Яна гучна рыпела, і гэты гук ледзяніў душу. Я некалькі разоў прасіў Лізу вярнуцца, таму што цямнела з неверагоднай хуткасцю, і, мяркуючы па ўсім, насоўвалася завіруха, але яна мяне не слухала. Яна хуткім крокам хадзіла паміж новых пахаванняў і ўпарта шукала вачыма знаёмае імя. Праз хвіліну яна спынілася, пачала хапаць ротам халоднае паветра. На крыжы я ўбачыў такое роднае імя. Сэрца прапусціла ўдар, а можа, забілася хутчэй у некалькі разоў. Крыж пакрыўся пластом снегу,  і я змахнуў яго, не думаючы аб тым, што заўтра раніцай усё будзе такім, як і хвіліну назад, і нават нашы сляды занясе завея. Вейкі жонкі сталі падобныя да маленькіх белых ільдзінак. Здаецца, яна плакала і фурман са словамі: «Пані, змерзнеце ж, пойдзем”, – павёў яе ў сані, прытрымліваючы за дрыготкія плечы. Я прастаяў там не больш за хвіліну…

Дарога дадому нібы патанула ў нейкім тумане. Апамятаўся я ўжо дома, грэючыся ля каміна. Дровы прыемна патрэсквалі, дзелячыся сваёй цеплынёй. Маёй жонкі ў гасцінай не было, і я здагадаўся, што яна ў далёкім пакоі дома. Ліза “перасялілася” туды тры тыдні таму. Я не ведаў, ці даравала яна мне, але растрывожанае сэрца падказвала, што яна не захоча перасякацца са мной у бліжэйшы час…

І сапраўды, жонка змагла сесці са мной за адзін абедзенны стол толькі праз шэсць дзён з той паездкі. Яна выглядала хваравіта-бледнай і часта кашляла…

А праз два тыдні Ліза памерла ад запалення лёгкіх. Доктар рабіў усё, што мог, але гэта не дапамагло...

Было гэта дваццаць гадоў таму. Я вельмі шкадую, што некалі прагнаў сваю маці. Жыццё кароткае, і яно не заўсёды дае нам шанс выправіць свае памылкі. Помні, што кожны ўчынак адгукнецца ў будучым.

Мабыць, час заканчваць. Бывай, мой дружа. Спадзяюся, ты знайшоў сваё шчасце”.

Гэты ліст быў адрасавана сябру дзяцінства Лаўрэнція Кіпрыянавіча. Аднак ён так і не быў адпраўлены…